Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 17 (28127) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новыя крытэрыі адраснай дапамогі

СТАР. 3



Звычайна незвычайны дом

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

# ГАРАДСКІ ПАЧАСТУНАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Больш за 80%**

*жыхароў краіны ўпэўнены ў сваёй бяспецы на вуліцы і ў грамадскіх месцах. Пра гэта сведчаць даныя сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам. Пераважная большасць апытаных (82%) заявілі, што адчуваюць сябе ў бяспецы, знаходзячыся на вуліцы, у грамадскіх месцах. Адмаўляюць гэта 16% рэспандэнтаў. Доля рэспандэнтаў, якія ў той ці іншай ступені ўпэўнены ў сваёй бяспецы, большая ў Гродзенскай і Мінскай абласцях (у сярэднім па 86,5%), меншая — у Брэсцкім, Магілёўскім рэгіёнах і Мінску (па 79%). Паляпшэнне сітуацыі са злачыннасцю за апошні год часцей адзначаюць жыхары Гродзенскай вобласці (45%), радзей — Мінска і Магілёўскай вобласці (у сярэднім па 32,5%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.01.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21234,00 | ▼ |
| Еўра | 23118,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,29 | ▲ |
| Укр. грыўня | 845,13 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Грошы

## Субсідыі на квартплату пачнуць налічваць ужо з мая

**Такім чынам, у краіне ўводзяцца безнаяўныя жыллёвыя субсідыі для частковай кампенсацыі аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі. Распараджэнне аб гэтым 26 студзеня падпісаў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

Гэтым дакументам вызначаны і тэрміны ўкаранення новай сістэмы. У прыватнасці, Гродзенскаму і Магілёўскаму аблвыканкамам даручана ўкараніць у арганізацыях, якія займаюцца улікам, разлікам і налічэннем платы за ЖКП і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі, аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы разлікаў за спажытыя насельніцтвам жыллёва-камунальныя і іншыя паслугі (АІС «Разлік-ЖКП») да 1 сакавіка, Брэсцкаму і Мінскаму аблвыканкамам, а таксама Мінскаму гарвыканкаму — да 1 красавіка, Віцебскаму і Гомельскаму аблвыканкамам — да 1 мая 2016 года.

Паводле гэтага распараджэння створана міжведамасная рабочая група для выпрацоўкі прапаноў па налічэнні грамадзянам сёлета з 1 мая такіх безнаяўных жыллёвых субсідый на базе АІС «Разлік-ЖКП». Кіраўніком групы прызначаны **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН.** У яе склад таксама ўвайшлі прадстаўнікі Мінжылкамгаса, Дзяржкаммаёмасці, Мінпрацы і сацабароны, Нацбанка, Мінфіна, Мінэнерга, МПЗ, аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Больш, чым работа

## ЧАЛАВЕК ЯК ЦУД

### Амаль трыццаць гадоў Валянціна Васкабойнік штодзень прыходзіць да тых, хто яе чакае

**Некаторыя лічаць, што словазлучэнне «сястра міласэрнасці», якое прыйшло да нас з мінулых стагоддзяў, мае толькі вобразны сэнс, азначае спагаду, цярпенне, дабрыню канкрэтнага медыцынскага работніка. Аказваецца, не толькі сэнс, але і пасада такая засталася. У таварыстве Чырвонага Крыжа працуюць медыцынскія сёстры міласэрнасці. З адной з іх, Валянцінай ВАСКАБОЙНІК, давялося нядаўна пазнаёміцца.**

### ЯК СТАНОВЯЦЦА АДЗІНОКІМІ

Валянціна Іванаўна жыве і працуе ў Кобрыне. Сёння яна як хуткая дапамога, сацыяльны работнік, суразмоўца і дарадчыца для дзевяці старых нямоглых людзей. Для многіх з іх медыцынская сястра стала самым блізкім чалавекам. Ну вось, напрыклад, як для сужэнцаў Веры Андрэеўны і Івана Іванавіча. Абаім пад 80 гадоў. Яны пераехалі ў свой час у Кобрын з Бранскай вобласці да дзяцей. Гэта была, можна сказаць, шчаслівая сям'я. І, вядома, бацьку з маці ніколі не спатрэбілася б дапамога работнікаў сацыяльнай службы альбо Чырвонага Крыжа, каб усё не скончылася ў адзін дзень... Дзеці загінулі ў аварыі.

Бацькі, да гэтага яшчэ даволі бадзёрыя і адносна здаровыя, пачалі паступова згасаць. Іх самаадчуванне стала нагодай звярнуцца ў адпаведную камісію, што і зрабіў участковы доктар. Сястра міласэрнасці стала ім не проста сувязным звяном са знешнім светам, але чалавекам, які цікавіцца іх жыццём.

— Вядома, найперш я выконваю функцыі ўрача, — гаворыць медсястра. — Але ж галоўная праблема Івана Іванавіча і Веры Андрэеўны заключаецца ў тым, што ў іх няма родных і сяброў у нашым горадзе. Найважнейшыя лекі для іх — простая чалавечая размова. Як і ўсе старыя людзі, яны любяць пагаварыць пра мінулае. Ну і, вядома, згадваюць пра дзяцей. Наплачуцца, даводзіцца супакойваць. Сыходжу тады, калі бачу, што мае падапечныя ў больш-менш нармальным стане. Добра, што яны яшчэ ўдваіх і падтрымліваюць адно аднаго. Гледзячы на гэтых людзей, усведамляеш, што нават тыя, у каго добрыя надзейныя сем'і, не застрахаваны ад адзіноты, — працягвае Валянціна Іванаўна. Што ўжо гаварыць пра бацькоў, чые дзеці выпіваюць, вядуць асацыяльны лад жыцця.

СТАР. 4

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАРАДАК

### Ён патрэбны і для бяспекі грамадзян, і для прыцягнення інвестыцый

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у калегіі МУС па выніках працы органаў унутраных спраў за 2015 год. На пасяджэнні калегіі былі разгледжаны вынікі аператыўна-службовай дзейнасці органаў унутраных спраў, унутраных войскаў МУС у 2015 годзе і вызначаны задачы на 2016 год.**

Аляксандр Лукашэнка абазначыў прыярытэты ў далейшай рабоце МУС. Паводле слоў Прэзідэнта, ёсць шэраг кірункаў і пытанняў, якія неабходна вырашаць не рэагуючы, а змагаючыся, не паддаючыся сумненням у правільнасці выбранага курсу.

Органам унутраных спраў трэба нарошчваць намаганні ў спыненні і прадухіленні распаўсюджання наркаманіі, кардынальна ўзмацніць барацьбу з крадзяжамі, змяніць сітуацыю са злачыннасцю ў вёсцы.

Прыярытэтную ўвагу МУС неабходна ўдзяляць абароне дзяцей і пажылых грамадзян ад злачынных замахаў. У ліку прыярытэтаў таксама процідзеянне эканамічнай злачыннасці. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў гэтым кірунку хацеў бы больш актыўнай работы з боку ведамства.

У цэлым, работа міліцыі дае магчымасць мець належны ўзровень грамадскай бяспекі ў краіне, заявіў Прэзідэнт. Ён прывёў звесткі незалежнага сацыялагічнага даследавання, згодна з якім амаль 80 працэнтаў грамадзян выказалі ўпэўненасць у сваёй бяспецы. На думку Прэзідэнта, гэта сведчыць аб тым, што народ высока ацэньвае работу міліцыі. «Я цудоўна разумею, што і сярод работнікаў ДАІ, і сярод міліцэйскага складу, чыноўніцкага — людзі розныя. Але ў цэлым нават не толькі наш народ, але і госці ацэньваюць вашу работу нядрэнна. За гэта я вам вельмі ўдзячны», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Сённяшняя сітуацыя патрабуе самага ўважлівага падыходу да падбору і расстаноўкі кадраў. Яшчэ адна задача заключаецца ў пераглядзе расстаноўкі існуючых сіл і сродкаў. Акрамя таго, перад МУС пастаўлена задача глыбока і ўсебакова прааналізаваць стан крымінагеннай абстаноўкі, вылучыўшы галоўныя прычыны і ўмовы змяненняў, што адбываюцца.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што ў рабоце міліцыі павінна праяўляцца прынцыповасць да тых, хто парушае закон. У гэтым кантэксце ён звярнуў увагу на неабходнасць падтрымання чысціні радоў унутры саміх органаў унутраных спраў. Міліцыя сваімі дзеяннямі павінна ствараць станоўчы вобраз у народзе.

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава будзе і ў далейшым надаваць прыярытэтнае значэнне пытанням барацьбы са злачыннасцю, абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян. «Нараўне з падтрымкай органаў унутраных спраў мае падтрыманні і спагнанне ў гэтай сферы заўсёды будуць вельмі высокімі», — адзначыў ён.

### Аб п'яных за рулём

Кіраўнік дзяржавы заклікаў прымаць самыя жорсткія меры ў адносінах да тых, хто ўчыняе правапарушэнні ў стане алкагольнага ап'янення, і асабліва па чыёй віне гінуць людзі. «Каб выпіў і баяўся да аўтамабіля падысці...», — адзначыў Прэзідэнт. «Нам трэба рабіць пакаранне за гэта не проста непазбежным, а жорсткім. І мы атрымаем пэўны эфект», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

### Аб лібералізацыі адказнасці

Прэзідэнт падтрымлівае прапановы МУС па лібералізацыі адказнасці адносна шэрагу правапарушэнняў, але заклікае да асцярожнасці. «Мы з міністрам абмяркоўвалі гэту тэму. Я ягo абсалютна падтрымліваю, — сказаў Прэзідэнт. — Забыў дома пасведчанне або яшчэ што-небудзь — мы пачынаем прыцягваць да адказнасці. У вас жа камп'ютар ёсць. Вы бачыце, вадзіцель ён ці не. За што ж прыцягваць?»

«Гэта адзін тып парушэнняў. Але ёсць і іншыя парушэнні, якія нібыта ўжо таксама трэба ледзь ці не адмяніць, перавесці з аднаго ўзроўню на іншы. Будзьце тут вельмі акуратнымі і асцярожнымі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

### Аб злачыннасці на вёсцы

Яшчэ адна праблема, на якой асабліва спыніўся кіраўнік дзяржавы, — злачыннасць у вёсцы. «Гэта датычыцца перш за ўсё пажылых і адзінокіх людзей, — падкрэсліў Прэзідэнт. — У гэтым годзе ў вёсцы трэба навесці парадак усімі сіламі і сродкамі. Не пакідайце сельскіх людзей адных са злачынцамі».

### Аб распаўсюджванні наркотыкаў

Прэзідэнт звярнуў увагу, што са свайго боку прыняў усе рашэнні, якіх патрабавалі тыя, хто змагаецца з наркаманіяй.

«Але настойваю чарговы раз: галоўнае — гэта фініш. Вось мы яго злавілі, асудзілі, пасадзілі, па-народнаму кажучы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І вось утрыманне гэтых людзей павінна быць самым жорсткім». Прэзідэнт нагадаў, што раней ставіў такую задачу, і даручыў праверыць, як гэта выканана.

### Аб новаўвядзеннях у ДАІ

«Грамадскасць відавочна негатыўна ацэньвае асобныя новаўвядзенні. У прыватнасці, беспадстаўнае перагароджванне аўтадарог знакамі рамонту для правядзення пад гэтым выглядам нейкіх праверак», — адзначыў Прэзідэнт. «Стварылі затор, людзі незадаволены. Знайдзіце іншыя метады. Не стварайце лішніх праблем», — пракаменціраваў Аляксандр Лукашэнка.

### Аб эканамічных злачынствах

Прэзідэнт лічыць няўхільнасць пакарання самай дзейснай прафілактыкай эканамічных злачынстваў. «Дзяржаўны кантроль за эканамічнымі працэсамі важны і аб'ектыўна неабходны. Аднак гэтая праца павінна ў сваёй аснове насіць папераджальны характар, а калі вінаваты — атрымлівай на поўную катушку!», — адзначыў Прэзідэнт.

Прэзідэнт лічыць неабходным наладзіць больш цеснае супрацоўніцтва з транснацыянальнымі карпарацыямі для прыцягнення ў краіну інвестыцый. Пры гэтым ён звярнуў увагу на неабходнасць жорсткага парадку. «Ні адзін камерсант не прыйдзе сюды, калі тут не будзе парадку, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Нам трэба ў гэты час утрымацца і прыцягнуць сюды тых, хто мае грошы, для таго каб зарабіць самім, каб народ жыў лепш».

### Аб кантролі прадпрымальнікаў

«Нам патрэбны кантроль, але гэты кантроль не павінен быць празмерным», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што праверкі павінны весціся толькі пры наяўнасці аператыўнай інфармацыі.

Пры гэтым Прэзідэнт дадаў, што ў першым квартале мае намер запрасіць на нараду прадстаўнікоў эканамічнага блока, асобных кіраўнікоў прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў, каб прадставіць ім факты сілавых структур аб выяўленых эканамічных злачынствах і тым самым спыніць размовы на тэму забароны праверак.

**Паводле БЕЛТА.**

## АДБЫЛАСЯ ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі графік сумесных мерапрыемстваў на перспектыву. У прыватнасці, увага была сфакусіравана на двух значных падзеях: пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета, якое адбудзецца ў канцы лютага ў Мінску, і III Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, што таксама пройдзе ў беларускай сталіцы ў чэрвені.

Асноўнай тэмай як учарашняй размовы, так і маючых адбыцца двух мерапрыемстваў з'яўляецца эканоміка. На ВДС эканамічныя пытанні будуць абмяркоўвацца на макраўзроўні, а ў час Форуму будзе разгледжана, як працуюць канкрэтныя галіны над пераадоленнем цяжкасцяў у эканоміцы.

У тэлефоннай размове гаворка ішла аб мерах па сінхранізацыі дзеянняў у цяперашніх умовах.

Лідары звярнулі ўвагу на факт пачатку дзеяння пагаднення Украіны з ЕС аб стварэнні зоны свабоднага гандлю і ў сувязі з гэтым абмеркавалі дзеянні краін на бліжэйшую перспектыву ў гэтых умовах.

Прэзідэнты закранулі і некаторыя пытанні функцыянавання Еўразійскага эканамічнага саюза.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін дамовіліся сустрэцца ў бліжэйшы час і ў закрытай і больш грунтоўнай размове абмеркаваць пытанні двухбаковых адносін, паведамляе прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы.

■ 25 гадоў Акадэміі кіравання



## Марат ЖЫЛІНСКІ:
# «Сапраўдны кіраўнік павінен адчуваць упэўненасць у тым, што ён робіць»

***Акадэмія кіравання павінна мабілізаваць свае сілы для эфектыўнага, якаснага гадавання таго інтэлектуальнага кіраўніцкага патэнцыялу, які неабходны краіне. Пра гэта заявіў Марат Жылінскі, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай 25-годдзю гэтай навучальнай установы.***

— Дзяржаўная сістэма кіравання даказала сваю эфектыўнасць, — упэўнены кіраўнік акадэміі. — Прывяду толькі адзін ключавы тэзіс. Нягледзячы на ўсе складанасці, беларусы не ведаюць, што такое кроў. Мы пазбеглі тых катаклізмаў, якіх не пазбеглі нашы суседзі. Гэты аргумент дае нам падставу казаць, што сістэма дзяржаўнага кіравання ў краіне эфектыўная. Так, яна патрабуе карэкціроўкі, ювелірнай апрацоўкі, тым не менш яна дзейнічае.

### АЎДЫТОРЫІ ДЛЯ МІНІСТРАЎ

***Адказваючы на пытанне, наколькі часта прадстаўнікі ўрада прыходзяць на вучобу ў Акадэмію кіравання, Марат Жылінскі заўважыў, што «ўрад увесь час сядзіць у нас за партай».***

— Мяне запрасілі на павышэнне кваліфікацыі, я заходжу ў аўдыторыю — і проста губляюся: сядзяць міністры, намеснікі міністраў. Літаральна зараз я вярнуўся з Інстытута дзяржаўнай службы (падраздзяленне Акадэміі кіравання. — **Аўт.**), там была лекцыя старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча — своеасаблівы майстар-клас для старшынь гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў.

Штогод у Акадэміі кіравання праводзіцца так званая «вучоба паслоў». Гэта тыднёвыя курсы, на якія прыязджаюць усе кіраўнікі дыпламатычных місій нашай краіны.

— У нейкім сэнсе гэта «звярка гадзіннікаў». Перад дыпламатамі выступаюць міністры, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта даводзяць да іх ведама тыя ці іншыя моманты, палітычныя рэаліі. Больш за тое, мы не замыкаемся на ўнутраных рэсурсах, а запрашаем сюды для чытання пэўных курсаў і нашых замежных калег. У прыватнасці, рэктара дыпламатычнай акадэміі МЗС Расіі Яўгена Бажанава — фігуру, якая ў суседняй краіне па значнасці сёння супастаўляецца з міністрам замежных спраў Лаўровым. Яўген Бажанаў правёў майстар-клас у нашай акадэміі.

### У НАС ВЯЛІКІ ВОПЫТ КІРАВАННЯ

***Рэктар Акадэміі кіравання адзначыў, што сапраўдны кіраўнік павінен адчуваць упэўненасць у тым, што робіць.***

— Калі такой упэўненасці няма, то яго справа асуджана на гібель, — лічыць Марат Жылінскі. — Кіраўнікі павінны быць ідэйна гатовыя служыць зямлі, на якой працуюць. Калі чалавек будзе думаць пра тое, што ён сёння тут, а заўтра за мяжой, то нам такі кіраўнік не патрэбен.

***Марат Жылінскі ўпэўнены, што беларусы ўвогуле маюць вялікія напрацоўкі ў сферы кіравання, але сябе недаацэньваюць.***

— Нічога падобнага, мы маем каласальны вопыт кіравання, — падкрэсліў рэктар Акадэміі кіравання. — Статуты ВКЛ цяпер з'яўляюцца помнікамі, з іх пісалася канстытуцыя Францыі. Мы не павінны забываць, што з'яўляемся нашчадкамі гэтага вопыту, не трэба саромецца паказваць гэта.

### НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА СВАІХ

***Паводле слоў Марата Жылінскага, Акадэмія кіравання цікавіцца, дзе працуюць яе выпускнікі.***

— У нас ёсць унутраная кадравая сістэма «Лотус», якую мы на пачатку 2015 года мадэрнізавалі. У гэтай базе знаходзіцца 25 тысяч выпускнікоў Акадэміі кіравання. Мы просім працадаўцаў, што прымаюць нашых выпускнікоў, інфармаваць нас у выпадку пераходу нашых былых студэнтаў на іншую пасаду. У нас ёсць аўтаматызаваная сістэма «Рэзерв», якая вядзе пастаянны маніторынг таго, дзе, у якой вобласці працуюць нашы спецыялісты.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

### Гавораць выпускнікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

**Віталій ВОЙЦІК, намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Белшына» па камерцыйных пытаннях:**

— Скончыў спецыяльнасць «міжнародны маркетынг» і атрыманыя веды прымяняю на практыцы самым непасрэдным чынам: займаюся экспартам — прасоўваннем прадукцыі свайго прадпрыемства за межы Беларусі. Мы пастаўляем аўтамабільныя шыны ў больш чым 60 краін свету. Працуем над тым, каб знізіць сабекошт і павялічыць прасоўванне новых беларускіх брэндаў на сусветным рынку. У гэтай справе вельмі дапамагаюць веды, атрыманыя ў Акадэміі кіравання. У прыватнасці, часта згадваю лекцыі Марыі Аляксандраўны Кізімы.

**Сяргей КРАСНЫ, намеснік дырэктара РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава па навуковай рабоце, член-карэспандэнт НАН Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук:**

— Я скончыў факультэт дзяржаўнага кіравання ў сацыяльнай сферы ў 2011 годзе. Акадэмія стала для мяне пэўным этапам у жыцці, і, канешне, аб вучобе там — найлепшыя ўспаміны. З гэтым звязана некалькі момантаў.

Па-першае, найвышэйшы ўзровень выкладчыкаў, незвычайныя для вышэйшых навучальных устаноў занятκі, методыка выкладання — усё робіцца не фармальна, каб зацікавіць слухачоў. Атрыманне адукацыі там не толькі важнае, але і прыносіць задавальненне.

Па-другое, атрыманыя ў акадэміі веды неабходныя для маёй работы. Яны не столькі неабходныя для мяне ў плане кіравання, бо я працую ў навуковай сферы, з выдатнымі вучонымі (у мяне ў падпарадкаванні адных толькі дактароў навук 25 чалавек), і я працую з імі цалкам незвычайна. У акадэміі стаў разумець пэўныя псіхалагічныя моманты, некаторыя нюансы стасункаў з калегамі, і мне працуецца нашмат лягчэй.

Наступная важная рэч датычыцца стасункаў у групе. Я пазнаёміўся з маладымі людзьмі, якіх назваў бы элітай нашага грамадства, многія з іх ужо займаюць вядучыя ролі ў дзяржаўным кіраванні. Мы настолькі пасябравалі, што цяпер адзін аднаму дапамагаем у самых розных сітуацыях.

Яшчэ адзін момант звязаны з маёй дыпломнай работай у акадэміі. Яна была прысвечана распрацоўцы праграмы скрынінгу раку прастаты, на яе абароне ў сценах акадэміі прысутнічала міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. Яна высока ацаніла гэтую работу, і потым я знайшоў падтрымку не толькі міністра аховы здароўя, але і міністра працы і сацыяльнай абароны. Як аказалася, гэта мела велізарнае значэнне, бо праграма была паспяховая і зараз атрымоўвае статус дзяржаўнай комплекснай праграмы, яна будзе распаўсюджвацца на ўсю тэрыторыю Беларусі.

**Дзяніс ЛЯДЗЯН, магістр эканамічных навук, вядучы спецыяліст аддзела стратэгіі і аналізу дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь:**

— Шчыра ўдзячны кіраўніцтву і прафесарска-выкладчыцкаму калектыву Акадэміі кіравання, а таксама маім сакурснікам не толькі за кампетэнтную падтрымку і дапамогу ў засваенні кваліфікацыі, але і за цудоўную магчымасць праявіць сябе на ніве навукі, спорту і грамадскай дзейнасці. Веру, што альма-матар чакае светлая будучыня, і заўсёды буду ганарыцца тым, што набыў бясцэнны вопыт менавіта ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Аднак у акадэміі ёсць такая асаблівасць — студэнты там адчуваюць сябе часткай нечага вялікага. У свой час я выбраў гэту навучальную установу, бо шукаў адукацыю з вопытам кіраўніка. Для мужчын кар'ера мае вялікае значэнне, і такі вопыт заўсёды будзе карысным. Гэта датычыцца не толькі працы, але ў цэлым зносін з людзьмі: быць тонкім псіхолагам, расстаўляць прыярытэты, фармуляваць задачы. Веды, атрыманыя ў Акадэміі кіравання, актыўна прымяняю на практыцы і буду ўдасканальваць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Добрая навіна

# ПЕНСІІ І ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ ПАДРАСТУЦЬ

## ЗА ПЕРШЫНЦА БУДУЦЬ ПЛАЦІЦЬ НА 240 ТЫСЯЧ БОЛЬШ

**З наступнага месяца павышаецца бюджэт пражытачнага мінімуму (далей БПМ). Яго памер у сярэднім на душу насельніцтва складзе 1 мільён 591 тысячу рублёў (на 24 тысячы больш, чым у папярэднім квартале). Для працаздольнага насельніцтва гэты нарматыў будзе раўняцца 1 мільёну 751 тысячы, для пенсіянераў — 1 мільёну 213 тысячам, для студэнтаў — 1 мільёну 539 тысячам. БПМ для дзяцей, у залежнасці ад узросту, складзе ад 1 да 1,7 мільёна. У сувязі з гэтымі зменамі павялічацца некаторыя выплаты.**

### 22 мільёны за другое дзіця

Дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці з лютага вырасце на 240 тысяч і складзе 15,9 мільёна (10 БПМ). Пры з'яўленні другога і наступнага немаўлят маці атрымаюць больш за 22 мільёны. Амаль 1,6 мільёна будуць плаціць жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. Сем'ям, што адначасова выхоўваюць малога да трохгадовага ўзросту і дзіця ад 3 да 18 гадоў, налічаць штомесячную дапамогу ў памеры амаль 800 тысяч.

Вырастуць таксама пенсіі. Праўда, не для ўсіх катэгорый. На 1,4 працэнта павысіцца мінімальная працоўная пенсія і надбаўкі за ўзрост. Пажылым ва ўзросце ад 75 да 80 гадоў будуць даплачваць па 298 тысяч рублёў, тым, каму споўнілася 80 і больш, — амаль па 398 тысяч. На 1,4 працэнта падрастуць і сацыяльныя пенсіі. Выплаты інвалідам 1-й групы складуць 1 мільён 750 тысяч у месяц, інвалідам 2-й групы — 1 мільён 352 тысячы (калі гэта інвалід з дзяцінства, то амаль на 160 тысяч больш), інвалідам 3-й групы — 1 мільён 193 тысячы. Сацыяльная пенсія па страце карміцеля на кожнае дзіця павялічыцца да 1 мільёна 352 тысяч.

### Новы крытэрый для адраснай дапамогі

Добрая навіна для тых, хто хоча распачаць свой бізнес: павялічацца дзяржаўныя субсідыі на адкрыццё сваёй справы. Цяпер прадпрымальнік-пачатковец можа разлічваць на стартавы капітал у памеры 17,5 мільёна (на 260 тысяч больш, чым раней). Калі вы збіраецеся станавіцца рамеснікам ці адкрываць сваю фірму ў сельскай мясцовасці, малых гарадах, то вам выдадуць 23,9 мільёна. Ваша справа звязана з укараненнем вынікаў навукова-тэхнічных даследаванняў і распрацовак — трымайце амаль 32 мільёны!

Дапамога незанятым сем'ям, якія перасяляюцца на новае месца працы, з лютага складзе 11,1 мільёна рублёў (прыкладна на 170 тысяч больш). Тым, хто пераязджае ў сельскую мясцовасць, гарады-спадарожнікі і малыя гарады даплацяць яшчэ па 3 мільёны 182 тысячы.

Разам з БПМ павялічыцца дапамога маладым і шматдзетным сем'ям пры аплаце крэдытаў на жыллё. Сёння памер гэтай падтрымкі для бацькоў з адным малым складае 62,7 мільёна. З наступнага месяца сума дапамогі падрасце на мільён. Сем'ям з двума дзецьмі, каб пагасіць крэдыт на кватэру, будуць выдаваць па 127 мільёнаў, а там, дзе тры і больш выхаванцаў, — па 159 мільёнаў (прыкладна на 2,5 мільёна больш, чым цяпер).

Разам з тым, адзначаюць у Мінпрацы, складаней стане атрымаць адрасную сацыяльную дапамогу. Для гэтага прыбытак чалавека павінен быць ніжэйшы за 1 мільён 591 тысячу.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# АТЛАНТЫКА ПРЫНЯСЕ МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

**У бліжэйшыя выхадныя спецыялісты Белгідрамецэнтра прагназуюць на тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, месцамі — дождж і мокры снег.**



Такім чынам, на наша надвор'е і надалей будуць уплываць цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання. Таму ў суботу на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы месцамі з мокрым снегам. Чакаецца туман, а ўначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Па паўночным захадзе краіны прагназуецца моцны вецер, парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень будзе 1—8 цяпла.

Амаль паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу і ў нядзелю. Месцамі згусціцца туман. Уначы і раніцай чакаецца галалёд, а на дарогах магчыма галалёдзіца. Раніцай і ўдзень у многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ў межах ад 0 да плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, будзе цёпла і вільготна ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак удзень на большай частцы тэрыторыі краіны таксама прагназуюцца кароткачасовыя мокры снег і дождж. У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў. Удзень будзе да плюс 5 градусаў, а па паўднёвым захадзе — месцамі да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# ВАМ ПІША... ЖКГ

## Аб аварыях і адключэннях мінчан будуць апавяшчаць праз мабільны дадатак

**У Мінску плануецца на працягу першага паўгоддзя 2016-га распрацаваць і ўвесці новы мабільны дадатак па рабоце гарадской сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пра гэта сёння паведаміў генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Віталь СМІРНОЎ.**

З дапамогай мабільнага дадатку ўладальнікі смартфонаў будуць атрымліваць імгненныя апавяшчэнні аб тым, дзе адбылося адключэнне гарачай вады, цеплазабеспячэння, электрычнасці і з якой прычыны, як доўга будуць весціся аварыйныя працы, калі пройдуць суботнікі і іншую інфармацыю, што датычыцца сферы ЖКГ сталіцы. Вядома, дасылацца такія паведамленні будуць па жаданні ўладальніка гаджэта.

— Выкарыстанне такога мабільнага дадатку дапаможа знізіць колькасць зваротаў грамадзян па тэматыцы ЖКГ, — упэўнены Віталь Смірноў. — З гэтай задачай паспяхова спраўляецца і партал «Мой Горад» 115.бел. Ён пазбавіў нас ад непатрэбнай перапіскі з гараджанамі.

Як адзначыў гендырэктар МГЖГ, за два першыя месяцы працы партала (лістапад — снежань 2015 г.) паступіла 2774 запыты ад мінчан, 2189 ужо выкананы. 585 засталіся на кантролі, яны звязаны з сезоннасцю выканання работ.

Апроч таго, разам з парталам у сталіцы працуе агульнагарадскі call-цэнтр, пазваніўшы ў які па нумары 115, можна пакінуць заяўку на выкананне камунальных работ.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ВУЧНЯЎ ТРЭБА ПАДТРЫМАЦЬ. КАЛІ ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ

**Урад рэкамендаваў пашырыць падтрымку вучняў пры праездзе на транспарце агульнага карыстання. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў №58 ад 26 студзеня.**

Дакументам унесены змены ў пастанову Савета Міністраў ад 16 лютага 2011 года №202 «Аб некаторых пытаннях праезду навучэнцаў». Прынятая пастанова пашырае рэкамендацыйныя нормы па сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў, якія атрымліваюць агульную сярэднюю і спецыяльную адукацыю, пры праездзе на транспарце агульнага карыстання на працягу навучальнага года. Гаворка ідзе пра паездкі ад месца жыхарства (месца знаходжання) да месца вучобы і назад. Калі раней гэтыя рэкамендацыі ўрада былі адрасаваны абласным і Мінскаму гарадскому Саветам дэпутатаў, дык цяпер яны распаўсюджваюцца і на раённыя. Дапоўнены таксама пералік відаў транспарту, да якіх датычныя механізмы сацыяльнай падтрымкі. Зараз яны будуць дзейнічаць і пры праездзе навучэнцаў у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа, а таксама аўтамабільным транспартам агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносін. Мяркуецца, што рашэнні Саветаў дэпутатаў па падтрымцы навучэнцаў пры праездзе на транспарце агульнага карыстання будуць прымацца пры наяўнасці сродкаў у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Ніколі не забудзем

# ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прэзэнтавалі кнігу пра гэты славуты музей

**Новы будынак, у які не так даўно пераехаў музей, ужо паспелі ахрысціць храмам памяці. Тысячы экспанатаў, змешчаных у дзесяці асобных залах, расказваюць наведвальнікам пра падзеі кароткага перадваеннага перыяду, гадоў самай крывавай вайны ў гісторыі чалавецтва і пасляваенных дзесяцігоддзяў. Каб даведацца пра гісторыю кожнага прадмета, неабходна не раз наведаць экспазіцыю. Або пагартаць старонкі кнігі, якая распавядае пра экспазіцыю, фонды і філіялы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

У кнізе, якая пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда», можна знайсці хрэстаматыйныя эпізоды з ваеннай гісторыі, а таксама адшукаць і малавядомыя або ўвогуле невядомыя дагэтуль дэталі. Перад чытачом паўстаюць як ключавыя фігуры, героі той вайны, пра подзвігі якіх напісаны не адзін твор, так і асобы, пра якіх мы чуем упершыню і, напэўна, ужо не забудзем ніколі. Як не забудзем і тое, адкуль у музеі з'явіўся дыван, падораны Канстанціну Ракасоўскаму туркменскімі ткачыхамі, хто стварыў дыяраму «Мінскі кацёл» і якія рэчы ў імправізаванай канспіратыўнай кватэры належалі Тацяне Якавенцы, у доме якой друкавалася падпольная «Звязда»...

Як расказала **рэдактар кнігі Наталля КАРАСЁВА,** аб'ём матэрыялу быў настолькі вялікі, што яго хапіла б яшчэ не на адну кнігу: «Але мы не ўпусцілі самага галоўнага і расказалі пра найбольш цікавыя музейныя экспанаты грунтоўна і разам з тым лаканічна».

— Разам з Выдавецкім домам «Звязда» Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны выдаў цудоўную кнігу-альбом, якая яскрава прэзентуе такую высакародную справу, як патрыятычнае выхаванне, і прыцягвае ўсё новыя колы зацікаўленых да экспазіцыі музея і ўвогуле да нашай вялікай гісторыі, — адзначыў **міністр культуры Беларусі Барыс**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Першы экзэмпляр кнігі з рук міністра культуры Барыса СВЯТЛОВА атрымаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр ФЕНЬ.**

**СВЯТЛОЎ.** — Каб ажыццявіць гэты праект, спатрэбіліся не толькі фінансавыя сродкі, а і вялікая навукова-даследчыцкая праца. Гэтую функцыю якраз на сябе ўзялі адпаведныя структуры музея, якія зрабілі ўсё дзеля таго, каб канцэптуальна склад гэтага выдавецкага праекта адпавядаў нашым уяўленням, якія звязваюць нашу гісторыю з сучаснасцю і транслююць для будучых пакаленняў тыя асноўныя каштоўнасці, якія сёння сабраны пад дахам музея і знаходзяцца ў яго фондасховішчах.

Міністр культуры падзякаваў і Выдавецкаму дому «Звязда», які, па яго словах, пастаянна спрыяе культурным, музейным ініцыятывам.

— Сімвалічна, што выданне выйшла літаральна праз год пасля адкрыцця новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — перакананa **намеснік дырэктара музея па навуковай працы Ганна ГАЛІНСКАЯ.** — Увогуле культура, сусветная, нацыянальная, духоўная — спецыяльная галіна выдавецкіх інтарэсаў. Апошнім часам вялікая ўвага надаецца вялікім праектам з выдавецкім суправаджэннем шматлікіх мерапрыемстваў як міжнароднага, так і рэспубліканскага ўзроўню, якія штогод праводзяцца ў розных рэгіёнах Беларусі. У выдавецтве нараджаюцца новыя арыгінальныя праекты, накіраваныя на папулярызацыю культуры. Менавіта такім праектам стала выданне «Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ЧАЛАВЕК ЯК ЦУД

## ЦЯРПЕННЕ І СТРЫМАНАСЦЬ

Такія, на жаль, таксама трапляюцца сярод падапечных сястры міласэрнасці. І амаль ва ўсіх ёсць пэўныя праблемы ў адносінах з родзічамі. Таму адзін з найважнейшых прынцыпаў работы — стрыманасць у выказваннях, ацэнках, ніякай інфармацыі нельга выносіць за сцены кватэры. Людзі дзеляцца сваімі крыўдамі, робяць гэта эмацыйна, бывае, згушчаюць фарбы, дапаўняюць падзеі здагадкамі. Дык вось, з адной калегай Валянціны Васкабойнік здарылася непрыемнасць. Спачуваючы сваёй падапечнай, жанчына расказала іншым людзям пра чэрствасць яе родных. А тыя ўсё сваякам і перадалі. Здарыўся вялікі скандал, потым родзічы прымірыліся, а сястра міласэрнасці засталася ворагам і для аднаго, і для другога боку. Пра гэты выпадак Валянціна Іванаўна даведалася падчас курсаў павышэння кваліфікацыі. Цяпер згадала, каб праілюстраваць асаблівасці сваёй работы. Яна ж медыцынскі работнік, а першы прынцып медыцыны: «Не нашкодзь!»

Яшчэ, адзначала суразмоўца, трэба валодаць вялікім цярпеннем. Наперш — тым, хто разглядае для сябе перспектыву работы сястрой міласэрнасці. Большасць пацыентаў, якіх даводзіцца дагледзець, людзі старыя, хворыя і даволі капрызныя. «Вось, напрыклад, кажу адной бабульцы: «Заўтра прыйду крыху раней, будзем купацца». Прыходжу, а мая пацыентка яўна не ў настроі. І што я магу? Настойваць, не зважаючы на яе старэчыя капрызы? Не. Калі мая асцярожная размова ў бок карыснасці і прыемнасці ванны не мае ніякага водгуку, спакойна пераношу купанне на наступны раз».

І такіх нюансаў тысячы ў самых розных варыяцыях. Валянціна Іванаўна згадвае аднаго вельмі старога пацыента, які страшна не любіў стрыгчы пазногці: «Як дзіця малое, заўпарціцца, і ўсё тут. Сілай жа не будзеш прымушаць былога вайскоўца ціха сядзець з працягнутай для гігіенічнай працэдуры рукой. Аднойчы адрасціў цэлыя кіпцюры і ніяк не згаджаўся абрэзаць іх, — успамінае медсястра. — А я кажу: «А што, Юрый Пятровіч, калі да вас часам зойдзе хто з былых саслужыўцаў? Вы ж заўсёды былі акуратным, падцягнутым, відным вайскоўцам». (Я не ведаю, якім ён быў, але трапляю ў самую кропку. Мой дзядок лагаднее. Хутка раблю ванначку, прыводжу рукі ў парадак. Ён аглядае свае пальцы і кажа: «Дзякуй, сястрычка!»

## ПЕРАД ДЗВЯРЫМА І ЗА ДЗВЯРЫМА

Заводжу гаворку аб тым, што не кожная медсястра з адпаведнай кваліфікацыяй зможа прысвяціць сябе такой вось рабоце. Валянціна Іванаўна пагаджаецца. Кажа, што трэба адкінуць усялякую грэблівасць, пагарду, трэба ўмець у кожным са сваіх пацыентаў бачыць чалавека, які мае патрэбу ў дапамозе. Аднойчы ў яе пад апекай была жанчына, якая доўга ляжала. У хворай утварыліся глыбокія пролежні. Раны трэба было кожны дзень апрацоўваць, калоць абязбольвальныя.

Пытаюся, як спраўляцца са сваімі эмоцыямі, калі на тваіх вачах пакутуе чалавек, а ты нічым не можаш дапамагчы. Мая суразмоўца задумваецца, а потым павольна гаворыць: «Гэта даецца нечым накшталт уласнага трэнінгу. Варта адразу настроіць сябе, усвядоміць, што калі зачыняеш дзверы кватэры свайго пацыента, усё пакідаеш за дзвярыма, бо цябе чакаюць іншыя людзі, якім патрэбна твая дапамога. Інакш цябе надоўга не хопіць, а гэта нікому не патрэбна».

«Не менш важна навучыцца пакідаць перад парогам падапечных свае праблемы. Здараецца, ідзеш, па дарозе абдумваеш нешта сваё, і здароўе бывае ў цябе не лепшым, і настрой адпаведным. Але перад тым, як націснуць на кнопку званка, на імгненне спыняешся, пераключаеш увагу, і ў кватэру заходзіш з усмешкай. Інакш не варта брацца за такую работу», — падсумоўвае Валянціна Іванаўна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

**Валянціна ВАСКАБОЙНІК (справа) — хуткая дапамога, сацыяльны работнік, суразмоўца і дарадчыца для дзевяці нямоглых людзей.**

## ЯК З РОДНЫМ ЧАЛАВЕКАМ

Разам заходзім да пацыенткі Веры Міхайлаўны Кукашук, якая вельмі рада прыходу медсястры. Веры Міхайлаўне ўсяго семдзесят гадоў, але дыягназаў у яе цэлы букет. Галоўная бяда — суставы, з-за якіх дрэнна ходзяць ногі. Да таго ж жанчына нядаўна пахавала мужа. Валянціна Іванаўна адразу мерае ціск. Паколькі прыбор паказвае вельмі высокія лічбы, медсястра знаходзіць патрэбную таблетку ў аптэчцы, ідзе на кухню па ваду. І толькі праз хвіліну-другую пасля прыёму лекаў дазваляе падапечнай пагаварыць.

Вера Міхайлаўна ахвотна расказвае, як яна працавала ў гарадской паліўнай арганізацыі. Некалькі гадоў удалося папрацаваць і пасля выхаду на пенсію, і далей ёй кантракт гатовы былі працягнуць, але здароўе не дазволіла. А муж яе, Аляксандр Іванавіч, 40 гадоў адпрацаваў у міліцыі... А цяпер вось застаецца адна забава, любімае хобі — вышываць. Урачы не вельмі рэкамендуюць вышыванне — з-за хваробы вачэй. Але ў светлы дзень, каля акна, яна дазваляе сабе заняцца любімай справай. А яшчэ чакае, калі да яе Валянціна Іванаўна забяжыць. Перамовіцца з ёй словам стала неабходнасцю — як з родным чалавекам.

**«Нават тыя, у каго добрыя надзейныя сем'і, не застрахаваны ад адзіноты».**

Ужо збіраемся адыходзіць, Вера Міхайлаўна гаворыць медсястры, што трэба было б наведацца ў паліклініку.

— Ісці цяпер слізка, небяспечна пры вашых праблемах. На наступным тыдні будуць выхадныя ў майго сына, папрашу, ён падвязе — кажа Валянціна Іванаўна.

## КРЫНІЦА СІЛ

Валянціна Васкабойнік ужо адсвяткавала уласнае 60-годдзе, даўно — удава. Але яна чалавек надзвычай энергічны. На банальнае пытанне наконт таго, адкуль бяруцца сілы, няспешна расказвае пра сваё жыццё.

Нарадзілася і вырасла ў расійскай глыбінцы. У бацькоў было тры дачкі, і ўсе сталі медсёстрамі. Замуж выйшла за лётчыка, ён і прывёз Валянціну ў Кобрын у 1972 годзе. Працавала медсястрой у паліклініцы, прайшла розныя аддзяленні. А ў 1987 годзе вызвалілася стаўка ў аддзяленні Чырвонага Крыжа. Ёй і прапанавалі. Згадзілася, таму што графік работы быў больш гнуткі, чым у паліклініцы. Спадзявалася, што будзе больш магчымасцяў удзяляць увагу ўласным дзецям. Варта сказаць, што раней спецыфіка гэтай службы была іншая, медсёстры аказвалі толькі медыцынскія паслугі. Цяпер дабавіўся сацыяльна-бытавы напрамак, на работу даводзіцца траціць больш часу. І вось ужо без малога трыццаць гадоў сястра міласэрнасці Валянціна Васкабойнік спяшаецца да сваіх падапечных, да тых, хто яе чакае.

— Апошняе і трымае ў рабоце, дае сілы, — разважае мая суразмоўца.

І ўспамінае амаль што даўні выпадак. Развозіла яна неяк велікодныя падарункі ад Чырвонага Крыжа адзінокім пенсіянерам. Падарункі былі добрыя: яйкі выдзеліла птушкафабрыка, хлебазавод прыгатаваў кулічы, спонсары дабавілі цукерак, іншых прысмакаў. Усё гэта асвяцілі ў царкве. Дастаўляла па спіску, пазваніла ў кватэру нават не сваёй падапечнай, а жанчыны, якую абслугоўвае сацыяльны работнік. Адкрыла маленькая, кволая бабулька. Медсястра працягнула ёй пакунак, а ў старой жанчыны слёзы пасыпаліся градам. Стала высвятляць, што здарылася, што яе так засмуціла. А тая адказвае, што раніцай малілася, прасіла ў Бога, каб хоць якую крошку булкі асвячонай дзе ўзяць, сама ўжо да царквы дайсці не можа... А тут цэлы падарунак, як цуд! І ўсё асвячонае. Цяпер і ў яе адзінокім жытле будзе свята. Ледзьве супакоіла расчуленую бабульку.

— Калі бабка дваццаць разоў падзякуе табе ўслед, пажадае здароўя, — то знаходзяцца сілы, разумееш, дзеля чаго жывеш. Наогул, на гэтай рабоце становішся філосафам, — разважае далей Валянціна Іванаўна. — Бо кожны дзень сутыкаешся з адзінотай, цяжкай старасцю, хваробамі старых, якія раней былі ваеннымі, партыйнымі работнікамі, настаўнікамі, рабочымі, многія з якіх маюць дзяцей. Ніхто дакладна не ведае, якая яго чакае старасць. І ніхто ў гэтым свеце ні ад чога не застрахаваны. На нейкім этапе скурай пачынаеш адчуваць, што доўг чалавека — праяўляць спагаду да нямоглага.

* * *

***Бывае, людзі ледзь не абураюцца, а то проста старающа хутчэй адмахнуцца, калі ў калектывах аб'яўляюць збор грошай на патрэбы Чырвонага Крыжа. Звычайна збіраюць капейкі, аб прызначэнні якіх, праўда, мала хто нешта ведае канкрэтнае. Дык вось, да ведама тых, хто зацікавіцца расходамі грамадскай арганізацыі: зарплата медыцынскай сястры міласэрнасці не дасягае двух мільёнаў рублёў чыстымі. Пра работу я пісала вышэй. І варта памятаць, што ніхто не ведае пра фінал свайго жыцця.***

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Кобрынскі раён.*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ТУТ ЖЫВЕ ВЕТЭРАН

**Першае мерапрыемства патрыятычнай акцыі пад назвай «Тут жыве ветэран» прайшло ў Брэсце. На доме, дзе пражывае ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Данілавіч Пралееў, з'явілася таблічка, на якой адлюстраваны ваенныя ордэны і напісаны словы падзякі абаронцу Радзімы. Прымацавалі ўказаны знак актывісты БРСМ разам са старшынёй абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Лідзіяй Раманюк.**

Дарэчы, акцыя была прымеркаваная да дня нараджэння ветэрана. Міхаілу Данілавічу споўнілася 92 гады. Яго цёпла павіншавалі, уручылі падарунак. А расказ былога воіна пра падзеі ваенных гадоў запісалі. Ён стане першай старонкай у электронный кнізе ўспамінаў, якую плануецца размясціць на інтэрнэт-рэсурсах Брэсцкай абласной арганізацыі БРСМ.

Арганізатарам акцыі выступае грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд міру». Кампанія распачалася з Мінскай вобласці і прадоўжылася ў Брэсце. Паводле слоў старшыні абласной арганізацыі Беларускага фонду міру Лідзіі РАМАНЮК, да 9 Мая плануецца наведаць усіх ветэранаў вайны і размясціць на іх дамах памятныя таблічкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## «ДЗЯКУЙ ЗА ЧУЛАСЦЬ І БЕЗДАКОРНУЮ СЛУЖБУ»

**Гэтыя словы Лідзія Клімчук са Старых Дарог Мінскай вобласці адрасавала начальніку Бабруйскага РАУС Міхаілу ЕРМАЛОВІЧУ.**

У лісце ў міліцыю жанчына паведаміла, што звярнулася да праваахоўнікаў яе прымусіў падман пакупнікоў. Праз аб'яву ў газеце яна прадала бычка на мяса, але хутка зразумела, што прадпрымальныя людзі з Бабруйска не далалі ёй 200 тысяч рублёў.

Спачатку Лідзія разгубілася, а потым знайшла ў інтэрнэце каардынаты бабруйскага райаддзела міліцыі і набрала першы па спісе нумар, як высветлілася, начальніка. Жанчына паскардзілася яму на невядомых крыўдзіцеляў і паведаміла нумар машыны, на якой павезлі яе злашчаснага бычка. Не прайшло і паўгадзіны, як на нячыстых на руку прадпрымальнікаў выйшаў нарад аператыўна-дзяжурнай службы РАУС і грошы былі перададзены грамадзянцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ЗАПАС НА ВЫПАДАК НЕЎРАДЖАЮ

**Лясгасы краіны летась нарыхтавалі ў два разы больш ляснога насення, чым планавалі: амаль 140 тон, што складае 211 працэнтаў ад гадавога задання.**

У тым ліку нарыхтавана 101,7 тоны жалудоў дуба (207 працэнтаў), з іх 8,4 тоны — селекцыйных, 30 тон насення хваёвых парод (амаль 222 працэнты), з іх 2,9 тоны — селекцыйных, і 8,2 тоны насення іншых парод. Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, усяго на працяглым захоўванні ў халадзільных камерах знаходзіцца звыш 36 тон насення хваёвых парод, што забяспечвае на выпадак неўраджайных гадоў пяцігадовую патрэбу лясгасаў у пасяўным матэрыяле.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ...ПЛЮС БУЛЬБАФІЛУМ НАЙПРЫГАЖЭЙШЫ

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 28 студзеня выпусціла ў абарачэнне новыя паштовыя маркі. На іх — архідэі саркахілус відавы, зігапеталум плямісты, дэндробіум адзіны, бульбафілум найпрыгажэйшы.**

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Цэнтральным батанічным садам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дызайн Алены Мядзведзь. У дзень выпуску ў сталічным аддзяленні сувязі №1 (крама «Філатэлія», вул Маскоўская, 16) адбудзецца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень». Да гэтага ж выпуску падрыхтаваны карткі для картмаксімумаў.

**Ул. інф.**




## НЕ ПРАЧНУЛІСЯ

### Трагедыя ў Барысаве: загінулі шасцёра

— Позна ўвечары ў сераду на пульт МНС паступіла паведамленне ад дзяжурнага аварыйнай газавай службы МВУ «Барысаўміжрайгаз», — паведаміла карэспандэнту «Звязды» **ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — Трэба было дапамагчы адчыніць дзверы ў кватэрах пяціпавярховага дома па вуліцы Днепроўскай. Пры апытанні высветлілася, што раней у адной з кватэр на трэцім паверсе былі знойдзены мёртвымі двое пажылых людзей.

Ратаўнікі прыбылі на месца падзей і праніклі ў кватэру, размешчаную па стаяку паверхам ніжэй. Там яны знайшлі яшчэ чатырох загінулых. Сярод іх — двое непаўналетніх, якім было 10 і 17 гадоў...

Канчатковага адказу на тое, чаму за адзін вечар загінулі шэсць чалавек у дзвюх кватэрах шматпавярховага дома, пакуль няма. Супрацоўнікі Следчага камітэта праводзяць усе неабходныя экспертызы, апытваюць сведкаў. Пакуль што дакладна вядома, што ў кватэры, аб якой паступіла паведамленне ў МНС, адчувалася рэзкі пах газу.

— Першы намеснік старшыні Следчага камітэта каардынаваў працу на месцы здарэння, — зазначыў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ.** — Заведзена крымінальная справа па факце неналежнага выканання сваіх абавязкаў службовымі асобамі МВУ «Барысаўміжрайгаз». Разглядаюцца розныя версіі трагедыі. Адна з іх — няспраўнасць газавага абсталявання.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



TV@R

## Дзмітрый КАРАСЬ:

# «КАЛІ ПРЫЯЗДЖАЮ Ў ВЁСКУ — ПРА АПЕЛЬСІНЫ НЕ ДУМАЮ»

**У дзяцінстве ён марыў быць пажарнікам, але атрымаў адукацыю харэографа. А потым з'явілася праца на тэлебачанні, дзе ён паспрабаваў сябе і як вядучы навін, і ў такіх праектах, як «Імперыя песні», «Танцуюць усе», «Добрай раніцы, Беларусь!». Калі ўсе творчыя планы, як яму здавалася, былі здзейснены, наш герой пераключыўся на будаўніцтва дома. І накіраваўся ў вёску... Ці не расчараваўся ён, з'ехаўшы з горада? Была гэта звычайная паўза ці новая магчымасць кардынальна змяніць жыццё? Гэтыя і іншыя пытанні мы задалі вядучаму праграмы «Тэлебарометр» («Беларусь 2») Дзмітрыю Карасю падчас сустрэчы.**

***— Ваш пераезд у вёску ўжо даўно не навіна. Але здзіўляе тое, што там вы займаецеся арганізацыяй культурных мерапрыемстваў для насельніцтва...***

— Усё гэта яшчэ развіваецца. Ідэя арганізоўваць канцэрты з'явілася адразу, як толькі пераехаў у вёску. Бо да мяне пачалі прасіцца ў госці сябры, артысты, тэлевядучыя. І я падумаў: а што ж яны проста так будуць прыязджаць? Зразумела, я заўсёды рады іх бачыць, гутарыць з імі. Але мне хацелася, каб з гэтымі людзьмі пазнаёміліся яшчэ і мае аднавяскоўцы, і людзі з суседніх вёсак. Тады і ўзнікла ідэя ладзіць розныя мерапрыемствы. Адкрыў серыю канцэртаў Віталь Карпанаў з групай «Дразды». Потым быў у нас вечар шансона. Затым прыязджаў шоу балет «Феерыя». Нам нават не верылі напярэдадні, што ў вёску прыедзе такі калектыў. Была ў нас творчая сустрэча са Святланай Бароўскай. Паколькі яна не спявачка, то людзі напярэдадні цікавіліся, як усё будзе праходзіць. Сустрэча доўжылася без перапынку дзве гадзіны. Цікава было і гледачам, і самой Святлане, бо такі фармат зносін для яе нязвыклы. Шостага лютага мы зноў рыхтуемся правесці вечар шансона — настолькі спадабалася тое, што мы ўжо рабілі. Зараз паедзем туды з пашыраным складам артыстаў. Па даце гэта прыпадае якраз на вечар сустрэчы выпускнікоў, таму, думаю, шматлікая аўдыторыя збярэцца. Наперадзе — сустрэча з цыганскім ансамблем «Алюр». А вясной адзначым 15-годдзе беларуска-літоўскага цэнтра, у якім праходзяць нашы мерапрыемствы. Плануем зрабіць яго грандыёзнае ўшанаванне. Вельмі прыемна, што гэты клуб «ажыў», таму што раней усё знаходзілася ў «спячым» рэжыме... Я, можа, і хацеў бы крыху зменшыць свой тэмп, але пакуль не магу.

***— Як прынялі вас на новым месцы суседзі?***

— Я там пакуль што наездамі, але, здаецца, ужо ўвесь раён у курсе, з кім яны жывуць па суседстве. Спачатку пра мяне ведалі толькі асобныя людзі. А цяпер заўважаю па рэакцыі ў краме ці ў падарожжах па навакольных вёсачках, што людзі пазнаюць мяне. Не так даўно са мной у вёсцы здарылася непрыемная гісторыя — скралі інструменты з гаспадарчай пабудовы. І ўжо на наступны дзень мне тэлефанавалі з суседняй вёскі, а потым і з Мінска людзі, каб спытаць, што здарылася. Навіна абрастала чуткамі: маўляў, шмат усяго скралі, але я хацеў бы запэўніць, што нічога каштоўнага ў маім доме няма. Там у большасці ўсё зроблена сваімі рукамі і рэчы не дарагія, таму выносіць няма чаго. Увогуле ў вёсцы ўсе адзін аднаго ведаюць. Адносіны па-рознаму складваюцца, але пры неабходнасці, калі захочаш атрымаць параду, табе ніхто не адмовіць.

***— Вы адзначалі неаднаразова, што вам важна стварыць камфортныя ўмовы жыцця. Чаго яшчэ не хапае для поўнага шчасця?***

— Мару зрабіць тэрасу, дзе будзе магчымасць размясціцца з кампаніяй. Магчыма, з часам зраблю кавярню для вячорак з сябрамі.

***— Вы чалавек, які любіць прысутнасць гасцей, або аддаяце перавагу цішыні і адзіноце?***

— Гасцей люблю. Але апошнім часам з тымі з іх, каму палюбілася гэтае месца, я заводжу гутарку пра тое, каб, можа, яны мне ў нечым дапамагалі, калі прыязджаюць. Хаця б лісце ў садзе прыбраць. І калі людзі адмаўляюцца, то мне такая пазіцыя крыху не зразумелая, таму што атрымліваецца, я наводжу прыгажосць, а людзям нічога не цікава, акрамя лазні і шашлыкоў. Але ўсе ўжо ў курсе такой маёй «палітыкі» і просяцца ў госці часцей тады, калі настроены хоць нешта зрабіць.

